УДК 070 (476.4)

*М.М. Караткоў* (г. Магілёў, Беларусь)

# КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА Ў ГАЗЕТАХ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

Крымінальныя з'явы заўсёды былі і, на жаль, застаюцца адным з бакоў жыцця грамадства. Таму і паведамленні аб іх у сродках масавай інфармацыі, галоўнай функцыяй якіх з'яўляецца аб'ектыўнае адлюстраванне навакольнай рэчаіснасці, – рэч заканамерная. Заўважым аднак, што пры падрыхтоўцы такіх матэрыялаў да друку журналіст павінен асабліва скрупулёзна ўзважваць іх магчымы ўплыў як на лёс канкрэтных людзей, так і на грамадства ў цэлым.

Псіхолаг Н.В. Брушлінская, якая вывучала ўплыў крымінальнай хронікі ў СМІ на паводзіны людзей, адзначала: "Інфармацыя аб паспяховых і беспакараных гвалтоўных дзеяннях натхняе другіх на падобныя паводзіны, часта ўслед за паведамленнямі ў СМІ аб незвычайных формах крымінальнага гвалту пачынаюць здзяйсняцца падобныя злачынствы, у тым ліку далёка ад тых месцаў, дзе яны першапачаткова былі зафіксаваныя. Існуе меркаванне, што ў падобных выпадках гледачы або чытачы авалодваюць новымі формамі агрэсіўна гвалтоўных паводзін праз вікарнае навучанне і, натхнёныя паведамленнем аб эпізодзе гвалту, у падыходзячай абстаноўцы рэалізуюць іх на практыцы. Экспазіцыя ўзораў сацыяльнага гвалту можа ўзбройваць людзей новымі мадэлямі агрэсіўных паводзін, якія не ўваходзілі раней у іх рэпертуар паводзін" [1]. Хаця ў дадзеным выпадку размова ідзе пераважна аб гвалце ў сям'і, думаецца, што высновы даследчыцы справядлівыя і ў адносінах крымінальных праяў у іншых сферах жыцця.

Негатыўна ўплывае на маральны стан чытацкай аўдыторыі і неапраўдана вялікая колькасць інфармацыі аб злачынствах. У свядомасці людзей, і перш за ўсё людзей з няўстойлівай псіхікай, праз тое ствараецца неадэкватная карціна



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэчаіснасці. Гэта можа прывесці да непажаданых для грамадства вынікаў, з чаго выцякае неабходнасць пэўнай "дазіроўкі" такога роду матэрыялаў. Аднак непараўнальна большае непасрэднае ўздзеянне, як станоўчае, так і адмоўнае, крымінальная хроніка можа аказаць на лёс саміх парушальнікаў законаў і іх блізкіх.

Таму, паведамляючы аб рознага роду злачынствах, карэспандэнт павінен быць гранічна аб'ектыўным і карэктным, кіравацца прынцыпам "не нашкодзь", а таксама цэлым шэрагам адпаведных прававых і этычных нормаў. Іх парушэнне часта прыводзіць да немалых непрыемнасцей, і не толькі для "герояў" публікацыі, але і для іх аўтараў. Не сакрэт, што падставай для значнай часткі судовых іскаў, якія прад'яўляюцца рэдакцыям газет, з'яўляюцца якраз рознага роду пралікі ў асвятленні крымінальных падзей.

Адзначаныя вышэй акалічнасці і абумовілі наш зварот да пытання аб ступені адпаведнасці прававым і прафесійна маральным нормам публікацый крымінальнай хронікі ў перыядычным друку Магілёўшчыны. Аб'ектам даследавання сталі ўсе нумары раённых, гарадскіх і абласных газет за 2008 і 2009 гады. Праведзены аналіз дазваляе прыйсці да вываду, што ў цэлым асвятленне крымінальных здарэнняў у прэсе Магілёўшчыны не выклікае істотных нараканняў. Удзельная вага публікацый на гэтую тэму складае ў сярэднім 2–3% ад іх агульнай колькасці, што не дае сур'ёзных падстаў гаварыць аб скажэнні агульнай карціны жыцця грамадства.

Практычна ва ўсіх друкаваных перыядычных выданнях вобласці пад рознымі рубрыкамі ("102", "Здарэнні", "Служба 102 інфармуе", "Крымінальная хроніка", "Крымінал" і да т. п.) перыядычна з'яўляюцца кароткія і, як правіла, нешматлікія паведамленні аб асобных злачынствах, часцей за ўсё – крадзяжах і бытавых забойствах. Аднак ступень увагі, якая надаецца крымінальнай тэматыцы ў цэлым, як сведчаць вынікі праведзенага намі кантэнт-аналізу 20 раённых і 4 гарадскіх і абласных газет Магілёўшчыны, адрозніваецца даволі істотна. На наш погляд, гэта абумоўліваецца найперш палітыкай іх рэдакцый у адносінах да вырашэння праблемы ўмацавання правапарадку. Пераважная большасць газет не абмяжоўваецца звычайнай канстатацыяй фактаў. Асноўны ўпор іх рэдакцыі робяць на прапаганду і тлумачэнне нормаў закона. Для таго звычайна выкарыстоўваецца форма тэматычных палос ("Sed lex", "Закон і мы", "Чалавек. Закон. Грамадства", "Чалавек і закон", "Шчыт і меч", "Падлетак і закон" і да т. п. ). Тут галоўным чынам змяшчаюцца выступленні прадстаўнікоў пракуратуры і аддзелаў унутраных спраў, інспектараў па справах непаўналетніх, а таксама статыстыка правапарушэнняў, і зрэдку як ілюстрацыя – паведамленні аб канкрэтных злачынствах. Найбольш, бадай, гэта характэрна для газет "Могилёвская правда" (Магілёў), "Родная ніва" (Клімавічы), "Кіравец" (Кіраўск), "Святло Кастрычніка" (Мсціслаў), "Асіповіцкі край" (Асіповічы), "Маяк Прыдняпроўя" (Быхаў).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Варта сказаць, што лічбавыя даныя па ўсіх відах правапарушэнняў за пэўныя прамежкі часу змяшчаюцца ў пераважнай большасці раённых газет. І гэта важна, бо дазваляе чытачам скласці адэкватную карціну рэчаіснасці. Час ад часу друкуюцца і матэрыялы па выніках разгляду крымінальных спраў у судзе. Такое практыкуецца ў газетах "Могилёвская правда", "Савецкая вёска"(Дрыбін), "Ленінскі шлях" (Горкі), "Зара над Друццю" (Бялынічы), "Чырвоны сцяг" (Краснаполле). Падобныя карэспандэнцыі могуць мець немалое значэнне для павышэння прававой свядомасці насельніцтва і прадухілення крыміналагенных сітуацый. Скіраванасць да гэтай мэты асабліва, бадай, выразна праяўляецца ў публікацыях журналістаў "Могилёвской правды". Яны імкнуцца звярнуць увагу чытача не столькі нават на тое, што і як адбылося, колькі на высвятленне таго, чаму гэта адбылося і што трэба рабіць, каб пазбегнуць падобнага ў будучым.

Як вядома, пры напісанні матэрыялаў, звязаных з крымінальнай тэматыкай, журналіст павінен асабліва скрупулёзна ўзважваць магчымы ўплыў сваёй публікацыі на лёс канкрэтных людзей і гранічна паслядоўна прытрымлівацца адпаведных нормаў закона і прафесійнай этыкі. Трэба сказаць, што ў асноўнай сваёй масе прааналізаваныя намі матэрыялы ў гэтых адносінах ніякіх нараканняў не выклікаюць. Аднак у той жа час адзначаюцца і асобныя прыкрыя выпадкі грубых парушэнняў, якія маглі мець негатыўныя наступствы і для саміх журналістаў, і для тых, пра каго яны пісалі, іх блізкіх, ды й для грамадства ў цэлым.

Іншы раз гэта здараецца і не па віне журналістаў. Так, у нумары газеты "Маяк Прыдняпроўя" за 18 красавіка 2009 г. рэдакцыя па рашэнню суда мусіла апублікаваць абвяржэнне. Яна па ініцыятыве Быхаўскага РАУС змясціла аб'яву аб пошуку злачынцаў. Але, як відаць, названыя ў ёй асобы аказаліся ні ў чым не вінаватыя, і выступілі з судовым іскам аб матэрыяльнай кампенсацыі маральнага ўрону Быхаўскім РАУС і раённай газетай. Суд задаволіў іск у адносінах РАУС, адмовіўшы ў задавальненні іску ў адносінах рэдакцыі выдання па прычыне яе фактычнай невінаватасці. Тым не менш, такі выпадак не спрыяў павышэнню рэпутацыі газеты.

Аднак куды горш, калі самі журналісты падрываюць аўтарытэт выдання, даюць падставы для судовага праследавання за парушэнне прававых нормаў у асвятленні крымінальных падзей... Так, 21 жніўня 2009 года газета "Вечерний Могилёв" пад рубрыкай "Дзяжурная часць" апублікавала заметку "Урач-хабарнік". У ёй гаворыцца: **"Нядаўна было ўзбуджана 9 крымінальных спраў у адносінах да былога намесніка галоўурача Быхаўскай цэнтральнай раённай бальніцы. Ён падазраваецца ў хабарніцтве, злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, крадзяжы", – расказаў намеснік начальніка ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных напрамках УУС Магаблвыконкама Андрэй Еўдакімаў.**

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Знаходзячыся пры пасадзе, 53-гадовы мужчына праварочваў афёры, фактычна вымагаючы хабар у будаўнікоў, якія займаліся рамонтам медустановы. За некалькі гадоў зламыснік "заробіў" на адкатах каля 30 мільёнаў рублёў. Напрыклад, наняўшы рабочых на аб'ект, ён патрабаваў у іх 10% ад сумы заключанага дагавора, і тыя, натуральна, пагаджаліся на такую здзелку, бо працаваць недзе трэба. Зараз урач-хабарнік арыштаваны. Яму "свеціць" да 10 гадоў пазбаўлення волі".

Што тычыцца графічна выдзеленага ў тэксце ліда заметкі, то ў адносінах захавання прававых нормаў ён бездакорны. У ім толькі канстатуецца факт арышту канкрэтнага чалавека *па падазрэнню* ва ўчыненні пэўных злачынстваў, але злачынцам ён не абвяшчаецца. Адказны работнік УУС дакладны ў выкладанні думкі, дзейнічае ў поўнай адпаведнасці з нормамі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Згодна ёй, ніхто не можа быць прызнаны злачынцам, пакуль яго віна не будзе даказанай і ўстаноўленай уступіўшым у законную сілу прыгаворам суда. Яго ж, як вынікае з публікацыі, яшчэ не было, вялося папярэдняе следства.

Карэспандэнт жа не звяртае ўвагі на гэтую важную акалічнасць і не клапоціцца аб карэктнасці выкладання фактаў. Заўважым, што ў другой частцы заметкі ён фактычна аб'яўляе арыштаванага злачынцам яшчэ да завяршэння следства па справе, а таксама рашэння суда. Аб тым, што пакуль толькі інкрымінуецца падследнаму, журналіст гаворыць як аб несумненна меўшых месца падзеях. Гэта з'яўляецца грубым парушэннем прававых нормаў, якое можа мець непрыемныя наступствы як для героя публікацыі, так і для рэдакцыі выдання. Бо, як сведчыць выпадак са змяшчэннем аб'явы аб вышуку ў газеце "Маяк Прыдняпроўя", і следчыя органы могуць часам памыляцца. І тады рэдакцыя апынецца ў незайздросным становішчы паклёпніка, якому, вельмі верагодна, давядзецца адказваць і перад судом. Не выратуе ў дадзеным выпадку і тое, што ў заметцы не ўказана прозвішча пацярпелага – яго асобу лёгка ідэнтыфікаваць па ўпамінанню аб займаемай да арышту пасадзе і ўзросце.

Заўважым, дарэчы, што неахайнасць журналіста ў адносінах да выканання сваіх абавязкаў выявілася і ў загалоўку публікацыі. На самай справе арыштаваны быў не ўрачом, а намеснікам галоўурача па гаспадарчай частцы, і да ўласна медыцыны ніякага дачынення не меў. Гэта закранула прафесійны гонар медперсаналу бальніцы. Па яго патрабаванню газета мусіла публікаваць адпаведнае ўдакладненне.

Падрыхтоўка матэрыялаў на крымінальную тэму патрабуе ад журналіста гранічнай карэктнасці ў выказваннях. "Вышукваецца за рабаванне" – гэта зусім не тое, што "вышукваецца ў сувязі з грабяжом", "арыштаваны за атрыманне хабару" – не тое ж самае, што "арыштаваны па падазрэнні ў атрыманні хабару". А "падазраваецца ў здзяйсненні злачынства" яшчэ не азначае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"здзейсніў злачынства". Пакуль суд не ўстанавіў віны падазронага, трэба абавязкова ўказаць, што ён менавіта толькі **падазраваецца** (абвінавачваецца) ў здзяйсненні злачынства і даць спасылку на крыніцу такой інфармацыі. Здавалася б, гэта ведае кожны журналіст. Тым не менш, як бачым, гэтыя нормы іншы раз парушаюцца. А часам сустракаюцца і наогул казусныя з пункту погляду логікі выпадкі: паведамляецца, і зноў-такі да выраку суда, аб тым, што нехта ўчыніў тое ці іншае злачынства, а ў канцы матэрыялу гаворыцца, што ён з'яўляецца толькі падазроным.

Напрыклад, у газеце "Магілёўскія ведамасці" за 23 кастрычніка 2008 года была апублікаваная заметка "Смерць доўгажыхаркі": "Злачынства, якое адбылося ў вёсцы Кадзіна Чавускага раёна, стала поўнай нечаканасцю для яе жыхароў.

58-гадовы сын забіў жыўшую з ім 91-гадовую маці, хаця ні відавочных прычын, ні перадумоў да гэтага не было.<...>

14 кастрычніка рана раніцай, знаходзячыся ў нецвярозым стане, ён некалькі разоў ударыў бабулю. Наступствы для здароўя пажылога чалавека аказаліся вельмі сур'ёзнымі. 16 кастрычніка ў 10.20 пацярпеўшая ў непрытомным стане была дастаўленая ў райбальніцу, дзе праз сем гадзін памёрла.

Падазроны затрыманы".

Па сутнасці, тое ж, што і ў папярэднім выпадку, бачым і ў змешчанай у нумары "Вечернего Могилёва" за 20 жніўня 2008 года заметцы "Сяльчане пакваліліся на зерне". У ёй, у прыватнасці, гаворыцца, што адзін шафёр (прозвішча не названа, але названа арганізацыя, у якой ён працуе і марка машыны) "<...> працуючы на перавозцы зерня, украў яго каля 6 тон з памяшкання склада. Крымінальная справа пакуль не ўзбуджалася, праводзіцца праверка".

Пакуль не адбылося суда, мае сэнс наогул не пісаць аб тым ці іншым крымінальным здарэнні. Бо чалавек можа аказацца і ні ў чым не вінаватым. А публікацыя ў газеце можа вельмі адмоўна паўплываць на яго лёс. Асабліва гэта тычыцца жыхароў адносна невялікіх населеных пунктаў, дзе ўсе ведаюць усіх. А калі пісаць, то ні ў якім разе не "апярэджваць" вердыкт суда, не гаварыць да яго абвяшчэння аб чалавеку як аб злачынцу. А для таго – найперш выразна аддзяляць неабвержныя факты ад любых меркаванняў. Не менш важна прытрымлівацца і нормаў прафесійнай этыкі, прыклады парушэння якой у прэсе Магілёўшчыны таксама, хаця і зрэдку, але, на жаль, сустракаюцца.

Так, напрыклад, у нумары хоцімскай раённай газеты "Шлях Кастрычніка" за 9 лютага 2008 года была апублікаваная заметка пад назвай "Гінуць людзі". У ёй паведамляліся звесткі аб забойствах на бытавой глебе ў раёне за апошнія гады, пры гэтым называліся імёны пацярпелых. Як вядома, ахвяры няшчасных выпадкаў або злачынстваў маюць права на асаблівую абарону

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

іх імёнаў. Наўрад ці была неабходнасць нагадваць, ва ўсякім разе, блізкім загінуўшых аб трагедыі, вярэдзіць іх душэўныя раны.

Думаецца, лепш было б не называць сапраўдныя прозвішчы і месца жыхарства "герояў" заметкі "Злодзеі атрымалі па заслугах", змешчанай 4 красавіка 2008 года ў кіраўскай раённай газеце "Кіравец". Парушэння закона ў дадзеным выпадку няма – размова ідзе пра людзей, якія па рашэнню суда пазбаўлены волі за ўчыненне крадзяжоў. Аднак аўтару не лішне было б, відаць, улічыць, што ўсе асуджаныя – непаўналетнія. Магчыма, што яны стануць на шлях выпраўлення, і таму наўрад ці трэба лішні раз нагадваць ім і іх блізкім пра былое. Апроч таго, упамінанне імёнаў у дадзеным выпадку можа ўскосна паспрыяць і вяртанню падлеткаў на крывыя сцежкі. Не сакрэт, што сярод пэўнай часткі моладзі асобы з крымінальным мінулым карыстаюцца аўтарытэтам як людзі, якія нічога і нікога не баяцца і з якіх таму варта браць прыклад. Ці не ўзнікне ў маладых людзей спакуса апраўдаць такую сваю "рэпутацыю" ў маладзёжным асяроддзі і пасля выхаду на волю?

У прынцыпе тое ж можна сказаць і аб заметцы "Супрацьстаяць крымінальным праявам", што была надрукаваная ў кіраўскай раённай газеце "Кіравец" 13 жніўня 2008 года. У ёй, у прыватнасці, гаворыцца: "Аналіз статычных дадзеных па падлеткавай злачыннасці зрабілі намеснік старшыні райвыканкама В. У. Гаршкова, начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх РАУС Пад'ялоўскі. Адзначылася, што сёлета павялічылася колькасць падлеткаў з "крымінальным талентам" з ліку школьнікаў. "Рэкардсменам" стаў вучань Баравіцкай СШ А. Міхалап, на рахунку якога 7 злачынстваў, некаторыя з якіх учыніў разам са сваім дзядзькам". Думаецца, што перш, чым надрукаваць такі матэрыял, варта было б падумаць і аб магчымых сацыяльных выніках. Бо, па вялікаму рахунку, атрымалася распіска ў нядольнасці і бацькоў, і школы, і ўлад справіцца з дзецьмі, асобныя з якіх ужо сталі проста-такі закаранелымі злачынцамі. А для некаторых падлеткаў – гэта і своеасаблівая падказка браць прыклад з таго ж А.Міхалапа, з якога ўсё, як з гусі вада. Думаецца, лепш было б або наогул не называць ні яго прозвішча, ні назвы школы, або змяніць іх.

У матэрыяле пад загалоўкам "Забітыя дзве жанчыны", змешчаным у газеце "Вечерний Могилёв" 17 кастрычніка 2008 года, паведамляецца, што каля вёскі Гарадзішча Магілёўскага раёна быў знойдзены труп 47-гадовай магіляўчанкі з прыкметамі гвалтоўнай смерці. Па словах намесніка пракурора Магілёўскага раёна, як адзначае аўтар, ужо ёсць падазроны, які з'яўляецца жыхаром вёскі Гарадзішча. Парушэння нормаў заканадаўства ў гэтай заметцы таксама няма. Аднак указанне на месца жыхарства падазронага можа быць у нейкай меры апраўданым хіба толькі ў тым выпадку, калі яно зроблена



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ў інтарэсах следства. Бо такое паведамленне можа выклікаць падазронасць і напружанасць ва ўзаемаадносінах вяскоўцаў, магчыма, абсалютна беспадстаўную.

Трэба сказаць, што судовыя іскі да рэдакцый газет Магілёўшчыны з прычыны парушэння імі прававых і прафесійна-маральных нормаў у матэрыялах крымінальнай хронікі – з'ява выключна рэдкая. Тлумачыцца гэта, на наш погляд, дзвюма прычынамі. Першая – гэта тое, што, на шчасце рэдакцый, органы дазнання памыляюцца не так і часта. Падазроны ж, калі ён на самай справе вінаваты ды не мае шанцаў пазбегнуць кары, наўрад ці стане падаваць у суд на газету за заўчаснае абвяшчэнне яго злачынцам, хаця ў прынцыпе і мае на тое права. Яму не да таго. Другая прычына – тое, што нашы людзі ў пераважнай большасці не вызначаюцца асаблівай нецярпімасцю да парушэння, скажам так, іх немаёмасных правоў і рэдка звяртаюцца ў суд з такой нагоды. Аднак становішча паступова мяняецца.

Як сведчаць вынікі нашага даследавання, выпадкі парушэння нормаў асвятлення крымінальных здарэнняў у прэсе Магілёўшчыны нешматлікія, можна сказаць, адзінкавыя. Але і іх нельга дапускаць, каб не нашкодзіць ні людзям, ні сабе. Неаслабны кантроль за якасцю матэрыялаў з боку кіраўніцтва рэдакцый тут асабліва патрэбны.

**Літаратура:**


1. *Брушлинская, Н.В.* Криминальное насилие в семье и его трансляция средствами массовой информации / Н.В. Брушлинская // Институт психотерапии и клинической психологии [Электронный ресурс]. – 2000. – Режим доступа: http://www.psyinst.ru/page.php34p=7. – Дата доступа: 7.01.2010.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова